9. http://vkontakte.ru/event20777730 [режим доступа 29.10.2011, 18:51]
10. http://tur-by.by/belarus/baza-otdyxa-azernyya-rostani-belarus/provoditsya-konkurs-graffiti [режим доступа 26.09.2011, 19:28]
11. http://news.tut.by/kaleidoscope/243137.html [режим доступа 30.10.2011, 19:28]

## ТРАГЕДЫЯ ПАЧАТКУ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ ПАД НАВАГРУДКАМ

*УА "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт"*

*Бычэнка А.У., 3 к., 4 гр., ЛФ; Быкаў Я.С., 3 к., 4 гр., ЛФ*

*Ваенная кафедра*
*Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Дрокін А.В.*

На досвітку 22 чэрвеня 1941 года, на тэрыторыі Беларусі распачаліся баявыя дзеянні. Першыя гадзіны як у люстэрку паказалі ўсе тыя супрацьлегласці, якія склаліся у галіне абароны і ваеннага будаўніцтва СССР у перадваенныя гады. Вайна аказалася нечаканай, войскі Заходняга фронту непадрыхтаванымі да баявых дзеянняў.

За першы дзень баёў нямецкія перадавыя часці прасунуліся па беларускай тэрыторыі на 35, а месцамі да 50 кіламетраў, адкрыўшы прастор для вядзення баявых дзеянняў асноўным сілам групы армій "Цэнтр".

Да канца чацвёртага дня вайны як на правым, так і на левым крыле Заходняга фронту нямецкія танкавыя злучэнні перамясціліся ў глыб беларускай тэрыторыі на адлегласць да 200 кіламетраў. У выніку двухбаковага ахопу немцамі асноўных сіл Заходняга фронту, склалася рэальная пагроза іх поўнага акружэння. Стала відавочным: трэба змяніць тактыку, абставіны прымушалі адступаць.

25 чэрвеня маршал Б.М.Шапашнікаў далажыў у стаўку аб склаўшыхся абставінах і папрасіў дазволу неадкладна адвесці войскі Заходняга фронту з беластоцкага выступу на лінію старых умацаваных раёнаў. Дазвол са Стаўкі быў атрыманы, і ў той жа дзень штаб Заходняга фронту пачаў вырашаць пытанні арганізацыйнага адводу войск.

13-я армія павінна была адысці на рубеж Ілья – Маладзечна – Лістапады – Геранены, 3-я армія – на лінію Геранены – Ліда – вусце ракі Шчара, 10-я армія – на рубеж Слонім – Быцень, а 4-я армія на лінію Быцень – Пінск.

Увесь час адступаючыя войскі вялі ар'ергардныя баі, у той жа час на флангах фронт усё далей і далей адкочваўся на ўсход. Нямецкія танкі рваліся з боку Брэст – Слонім і Сувалкі – Ліда, яны імкнуліся замкнуць кольцы акружэння.



Репозиторий ГрГМУ

Войскі 3-й арміі адступалі на Масты і Навагрудак. Армія імкнулася, нягледзячы ні на што, як мага далей прабіцца на ўсход, хаця рабіць ёй гэта з кожнаю гадзінаю было ўсё цяжэй. З цяжкімі баямі адыходзіла і 10-я армія. Асабліва цяжкія баі разгарэліся ў раёне Ваўкавыска і Зэльвы.

Калі асноўныя сілы 10-й арміі падышлі да ракі Зельвянкі, пераправы тут ўжо былі заняты немцамі. Каб пазбавіць магчымасці савецкія войскі прарвацца на ўсход, немцы разбурылі масты. Войскам арміі прыходзілася адшукваць броды, наводзіць часовыя пераправы, што патрабавала дадатковага часу, затрымлівала рух арміі на ўсход.

Каб не прапусціць савецкія войскі на ўсход, фельдмаршал Клюге загадаў сваім часцям перайсці да абароны на рубяжы Слонім – Дзярэчын – Зэльва – Ружаны.

Але нягледзячы на прынятыя немцамі меры, знішчыць войскі 3-й і 10-й армій ім не ўдалося. Праз вузкі калідор Масты – Дзярэчын часці гэтых армій адышлі ў раён Навагрудка і часткова ў Палессе.

Пасляй гэтай спробы галоўныя намаганні танкавых груп Гота і Гудэрыяна былі скіраваны на больш глыбокі абыход войск Заходняга фронту. Фельдмаршал Бок патрабаваў ад камандуючых танкавымі групамі як мага хутчэй выйсці ў раён Мінска, каб замкнуць маштабныя кольцы акружэння.

У 17 гадзін 28 чэрвеня 12-я танкавая дывізія з групы генерала Гота, пасля зацяглых баёў, уварвалася ў сталіцу Беларусі – горад Мінск. На наступны дзень, 39-ы і 47-ы матарызаваныя корпусы 3-й і 2-й танкавых груп злучыліся ў раёне Мінска. Войскі 13-й арміі ў асноўным паспелі адысці на ўсход.

У той жа час злучэнні і часці 3-й і 10-й армій якія адыходзілі з Гродна і Беластока на Навагрудак, аказаліся ў нямецкім акружэнні. Аказалася ў акружэнні і частка войск 13-й арміі.

Але танкавыя кліны ўяўлялі толькі знешнюю лінію "катла". Патрабавалася яшчэ і ўнутранае, больш шчыльнае кольца акружэння, якое складалася б з пяхотных часцей, якія замацаваліся б на мясцовасці. Таму ўслед за танкавымі групамі на беларускую зямлю рынуліся матэрызаваныя нямецкія дывізіі, на якія і была ўскладзена задача стварэння ўнутранага, суцэльнага кольца акружэння.

Колькі ж дывізій Заходняга фронту аказалася ў поўным акружэнні пад Навагрудкам? Адказаць на гэтае пытанне цяжка. У розных крыніцах сустракаюцца розныяя лічбы. Але найбольш часцей сустракаюцца наступныя: 11 дывізій, з якіх 2 дывізіі 3-й арміі, 6 з 10-й арміі і 3 з 13-й арміі.

Аб'ектыўна склалася так, што акружаныя войскі ў раёне Налібоцкай пушчы былі прадстаўлены самі сабе, ім не было адкуль чакаць дапамогі, яны маглі спадзявацца выключна на ўласныя сілы і магчымасці. Становішча акружэнцаў ускладнялася яшчэ і тым, што яны не ведалі намераў, сродкаў і сіл праціўніка, не мелі паміж сабою ўстойлівай сувязі, былі раз'яднаны па частках, не мелі адзінага камандавання.



Рэпазіторый ГрГМУ

Не было сярод акружэнцаў і адзінага погляду на характар, перспектывы і тактыку дзеянняў ва ўмовах поўнага акружэння. Можна выдзеліць тры асноўныя падыходы, якія панавалі сярод акружэнцаў.

1. Значная частка камандзіраў лічыла, што ў склаўшыхся абставінах патрэбна сторогае выкананне апошніх вядомых ім загадаў штаба фронту – утрымліваць Мінскі ўмацаваны раён чаго б гэта не каштавала.

2. Другі падыход заключаўся ў тым, што трэба перайсці да тактыкі партызанскіх дзеянняў і такім чынам дачакацца падыходу савецкіх войск, вызвалення з "катла" і злучэння з асноўнымі сіламі Чырвонай Арміі

3. Трэці падыход, які падзялялі найбольш цвяроза мыслячыя афіцэры і генералы – сваімі сіламі прарваць кольца акружэння і з баямі праз акупіраваную немцамі тэрыторыю выйсці на злучэнне з асноўнымі сіламі Чырвонай Арміі. Гэта быў цяжкі, але найбольш рэальны выхад з канкрэтна склаўшыхся абставін.

Трэці варыянт не адразу, а толькі з часам стаў пануючым.

Па меркаванню некаторых камандзіраў, найбольш перспектыўнымі былі шляхі адыходу з акружэння ў паўднёвым і паўднёва-ўсходнім накірунку, у палескія балоты, дзе ва ўмовах балоцістай мясцовасці немцы не маглі разгарнуць свае танкавыя армады. Многія з камандзіраў-акружэнцаў менавіта так і дзейнічалі.

Кацёл пад Навгрудкам стаў вялікім дасягненнем нямецкай арміі: у акружэнні былі значныя сілы праціўніка. З другога боку, гэты кацёл стаў і галаўным болем для вышэйшага нямецкага камандавання, бо пакідаць такую колькасць войск праціўніка ў сваім тыле было недапушчальным.

Нямецкае камандаванне гэта разумела. І таму фельдмаршал фон Бок распрацаваў план па знішчэнню Навагрудскага "катла". Гэты план заключаўся у тым, каб сіламі дзвюх нямецкіх армій, як удаўкай, імкліва звузіць кольца акружэння да поўнага знішчэння праціўніка. Рухомыя танкавыя і матэрыязаваныя часці павінны складаць рэзерв, на выпадак прасачэння савецкіх груп праз нямецкія рубяжы акружэння, з мэтаю іх хуткай ліквідацыі. Для выканання гэтай маштабнай аператыўнай задачы з раёна Вільні на Беларусь была перакінута 900-я нямецкая брыгада, а часці генерала Гота правялі мініраванне акружаных савецкіх войск.

Немцы планавалі правесці гэтую аперацыю за некалькі дзён. На самай справе галоўныя сілы 9-й і 2-й нямецкіх армій вымушаны былі весці баявыя дзеянні з акружанымі савецкімі войскамі ў раёне Налібоцкай пушчы да 8 ліпеня 1941 года.

У заключэнне хочацца адзначыць, што нягледзячы на тое, што гэтыя падзеі адбываліся амаль 70 год таму, памяць пра тых людзей якія супрацьстаялі фашыстам у той цяжкай вайне, павінна быць вечная, і кожны павінен гэта ведаць.

Репозиторий ГрГМУ